*Алена Боганева*

# ЖАНРАВАЯ СПЕЦЫФІКА І ФУНКЦЫЯНАЛЬНЫЯ АСАБЛІВАСЦІ ВУСНЫХ АПАВЯДАННЯЎ ПРА ЦУДЫ Ў ТРАДЫЦЫЙНАЙ СЕЛЬСКАЙ КУЛЬТУРЫ

Вусныя апавяданні пра цуды належаць не столькі да сялянскай (або гарадской) культуры, сколькі да пэўнай канфесійнай вуснай традыцыі, прыхрамавага асяроддзя. Разам з тым, класічная сельская традыцыйная культура накладае свой адбітак на гэтыя апавяданні.

Прывядзем два тыповых прыклады: «*Мне сказалі на апірацыю іці. А мы прышлі з дзедам дамой, я гавару: «Пайду осенью». <...> Лягглі спаць, а вот ета во ноччу ён мяне за руку: «Ідзі на апірацыю, ідзі!». <...> Старычок, бародка беленькая, рубашка белая, як раньшэ такія саматканыя, паяском падпаясаны. Ён мяне ўжо сколькі раз <дапамагаў>* [*1]. <...> <І гэта наяву ці ў сне?> *Наяву. Такій старычок. А ета вот ён, што мне сказаў на апірацыю ісці, так ці я спала, ці ня спала, ня знаю, ня помню. <...> А утрам праснулісь — верыць, ня верыць, што дзелаць?. І паехалі на апірацыю. Паехалі. А вот еслі б я да осені <дачакала> – я б ужэ даўно згніла.* <Так гэты старычок, то хто*?> Ангел Храніцель, да*» [**1]. Другі прыклад: «*І як мне стане… Вот прыйдзецца картоплі капаць. І я ўкленчу да Маткі Боскі і модлюса. І кажу: "Матко Боска, дапамажы мне! Ты ж ведаеш, што я анна, што я нешчасна… Дапамажы!" І знаеце, чыста мне прыйдзе хто і дапаможа. І мне ўсё прыйдуць і зробяць, і помогуць… І сын прыедзе… І паляньце Вы… Плакала раз, плакала, што няма хлопца, <...> і кажу: «Матко Боска, няўжэ то Ты не бачыш, што я плачу? Няўжэ то мой сынок не прыедзе да міне?»Назаўтра я ўстала, а мой сынок ужо прыехаў! Ну Вы паляньце! Гэто цуд, шчэ й які цуд!*» [**2].

Жанравую прыналежнасць прыведзеных апавяданняў можна вызначыць па-рознаму. Калі зыходзіць з класічнага пропаўскага вызначэння легенды як празаічнага мастацкага расказу, змест якога прама ці ўкосна звязаны з пануючай рэлігіяй [2, *271*], то перад намі тэксты легенд. Але, відавочна, што прыведзеныя прыклады змястоўна розныя: у першым расказчыца сустракаецца са звышнатуральнай сілай – анёлам-ахоўнікам – «наяву»; у другім — няма бачнай сустрэчы са светам звышнатуральнага, але рэальныя падзеі асэнсоўваюцца расказчыцай як цуд.

Калі ж параўнаць гэтыя тэксты з этыялагічнымі або духоўна-этычнымі легендамі, розніца будзе яшчэ больш істотнай. Этыялагічныя і духоўна-этычныя легенды – гэта фабулаты, якія адлюстроўваюць калектыўнае светаўспрыманне [*2]: этыялагічныя легенды – пра заканамернасці светапабудовы і этыялогію аб'ектаў, духоўна-этычныя – пра мараль, каштоўнасці, грахі і дабрадзеі. Вусныя апавяданні пра цуды могуць быць і мемаратамі, і фабулатамі, але нават фабулаты пра цуды ў адрозненне ад легенд маюць галоўным сэнсава-вобразным цэнтрам чалавека, а падзейным – выпадак з ім.

Разам з тым, па характару тэкстаў бачна, што падстава аб’ядноўваць апавяданні пра цуды з легендамі ўсё ж ёсць: і ў тых, і ў іншых фігуруе Боская сіла, а таксама звышнатуральныя персанажы хрысціянскага свету – Бог, Божая Маці, святыя, анёлы.

З другога боку, апавяданні пра цуды блізкія да былічак: у апошніх таксама апісваецца сутыкненне чалавека са светам звышнатуральнага, толькі ў былічках гэта звышнатуральная сіла выступае, як правіла, варожай і небяспечнай для чалавека.

Зыходзячы з такога сэнсава-вобразнага падабенства, адносна жанравай прыналежнасці апавяданняў пра цуды можна пагадзіцца з Ю. М. Шэварэнкавай, якая прапанавала для гэтых міжжанравых утварэнняў тэрміны легенды-былічкі і легендарныя апавяданні [3, *41–57*].

Легенды-былічкі – вусныя апавяданні пра цуды, незвычайныя здарэнні, сустрэчы са звышнатуральнай сілай Боскага паходжання – Богам, Божай Маці, святымі, анёламі. Легендарныя апавяданні – вусныя расказы пра рэальныя выпадкі і падзеі, асэнсаваныя ў рэлігійным плане, звычайна як Божая дапамога або пакаранне.

Для высвятлення спецыфікі гэтых пераходных жанраў разгледзім іх асобна, параўноўваючы з жанрам легенд і былічак.

Звышнатуральныя хрысціянскія персанажы і этыялагічных, і духоўна-этычных легенд дзейнічаюць як галоўныя героі ў апакрыфічна-евангельскіх сюжэтах. Напрыклад, у цыкле этыялагічных народнабіблейскіх легенд, аб’яднаных тэмай «уцёкі Святога сямейства ў Егіпет» Божая Маці з Хрыстом-немаўляткам хаваецца ад войска Ірадава пад дрэвы, у выніку чаго, у залежнасці ад сваіх паводзін, дрэвы набываюць пэўныя якасці і вызначаюць на будучыню адносіны да сябе (асіна не схавала Святое сямейства – з тых пор трасецца і лічыцца нядобрым дрэвам; ёлка апусціла лапкі і схавала Божую Маці – з тых часоў вечназялёная, упрыгожваецца на Каляды, у яе пярун не б’е) [1, *361–363*]. У легендах-былічках тыя ж персанажы – Бог, Божая Маці і інш. заўсёды выступаюць як сіла, якая дапамагае чалавеку (значна больш рэдка – карае) у яго прыватным, асабістым жыцці, але галоўны герой тут ужо чалавек.

Легенды-былічкі (і легендарныя апавяданні) у форме мемаратаў слаба вылучаныя з маўленчай плыні і выконваюць інфармацыйна-дыдактычныя функцыі. Былічкі таксама маюць інфармацыйна-дыдактычныя функцыі, але інфармацыйнасць і дыдактыка ў гэтых жанрах прынцыпова адрозніваюцца.

Інфармацыя ў былічках тычыцца галоўным чынам перадачы звестак пра міфалагічных персанажаў, вопыту камунікацыі з імі, а дыдактыка носіць прэвентыўна-засцерагальны характар. Міфалагічныя вобразы былічак (дамавік, русалка, лесавік, лазнік і інш.) заснаваныя на мясцовых вераваннях, яны набываюць свае канкрэтныя абрысы і выявы толькі ў апавяданнях пра сустрэчу з імі.

Легенды-былічкі не маюць патрэбы ў перадачы інфармацыі ўласна пра звышнатуральных хрысціянскіх персанажаў, таму што апошнія функцыянальна і змястоўна дакладна задаюцца рамкамі канфесійнага

веравучэння, а вопыт камунікацыі з Богам, Божай Маці, святымі заўсёды унікальны. Магчыма, у сувязі з гэтым легенды-былічкі не маюць корпуса традыцыйных матываў і сюжэтаў, адзначаных (міфалагізаваных) мастацкага часу і прасторы – тут яны заўсёды нейтральныя. Асноўная мэта легенд-былічак – сцвярджаць прадметы веры, сам факт існавання Боскага звышпачуццёвага свету, яго ўплыў на жыццё чалавека. Што тычыцца дыдактыкі, то тут яна накіравана на маральнае ўдасканаленне чалавека, яго жыццё па запаведзях і да т. п.

Хрысціянскія звышнатуральныя персанажы маюць у расказах пра цуды ў вуснай сельскай культуры характэрнае знешняе ўвасабленне, што выразна адрознівае іх ад традыцый хрысціянскай кніжнасці, вусных расказаў пра цуды ў гарадскім прыхрамавым асяроддзі. Напрыклад, Бог або святы Мікалай у легендах-былічках звычайна паўстаюць у выглядзе старога дзядка. *«<Бачыць> — ідэ дэдок, з торбочкою... «То, — <казалі потым людзі>, — Бог тобе прыдався. Ты без бацька годовався, трое дэтэй було. І тэбе Бог прыдався»* [**3]. «*Гэта цяпер краны, а тады калодзец па-надворку быў <...>. І прышла я браць воду, выйшаў старэнькі, сівенькі, як сьнег. <...> Кажу ж, сама бачыла, бачыла ж, ну. І кіёчак на плячы і торбачка. Шапка, <як> некалі даўней бальшавікі <насілі>, з пупам: адно апушчано вухо, а другое задрана ў гору. От на нагах лапці з валокамі, во тут нагавічкі такія длінненькіе. І край мяне так праходзіць ён. Я глянула, думаю: жабрак. <...> Выйшаў ён, а дзе ён дзеўся? <...> Прапаў недзе. Я стала расказывать жанчынам, а адна жанчына кажэць: «А гэта Нікалай Чудатворац цябе ахраняў. Нада, каб ты яму малілася. Ён цябе і твае дзеткі ахраняў». Нікалай Чудатворац, сівенькі такі во. Ён можа паказацца і старэнькім, можа і афіцэрам*» [**4].

Як можна заўважыць, у прыведзеных прыкладах Бог, свяціцель Мікалай, анёл-ахоўнік паўстаюць амаль у аднолькавым знешнім увасабленні: сівенькі стары дзядок, торбачка, кіёчак. Ні ў іканапісных выявах, ні ў агіяграфіі, ні ў хрысціянскай літаратуры немагчыма сустрэць такога анёла-ахоўніка. Анёлы паўстаюць у хрысціянскай кніжнасці звычайна самавітымі прыгожымі юнакамі у белых рызах, але ніяк ні старымі ў саматканых рубахах. Свяціцель Мікалай у прыведзеным вусным апавяданні выглядае як тыповы селянін, тады як у кананічных выявах на іконах паказваецца звычайна ў архіепіскапскім уборы з мітрай або без мітры на галаве. Відаць, да апошняй дэталі ўскосна адсылаюць словы інфарманткі, што «*ён можа паказацца і старэнькім, можа і афіцэрам*».

У прыведзеных апавяданнях з анёлам-ахоўнікам і святым Мікалаем таксама звяртае на сябе ўвагу падрабязнасць і канкрэтыка апісання іх знешніх рыс і вопраткі: «*старычок, бародка беленькая, рубашка белая, як раньшэ такія саматканыя, пояском падпаясаны*» і «*шапка, <як> некалі даўней бальшавікі <насілі>, з пупам: адно апушчано вухо, а другое задрана ў гору. От на нагах лапці з валокамі, во тут нагавічкі такія длінненькіе*». Верагодна, такая дэтальнасць апісання заклікана не проста пераканаць слухача ў рэальнасці бачанага, але і паказаць, візуалізаваць, даць такі яркі і

пераканаўчы вербальны партрэт персанажа, што слухач не проста ўжо ўспрымае апавяданне пра яго, але амаль што бачыць.

Сярод сельскіх легенд-былічак амаль не сустракаюцца апавяданні пра сустрэчу з Хрыстом, а калі сутракаюцца, то гэта чыста індывідуальнае бачанне, і ў такіх расказах тыповага выгляду Хрыста не існуе. «*Ён, <муж>, не п'яніца, точно. Ну, выпівае, выпіваў тады... Даказывае, шчо я быў цьявёрозы тады. А мы на яго: да ты п'яны быў... Ішоў о тут во, не дахадзя да Веры Матвеевай... <...> Кага: «Галубэ-галубэ таке небо... І стаў Ён перада мною і стаіць – Ісус. Такі вісокі! У такой некай будто жоўтае... Таке будто жоўтае адзеянье на Ём, будто блішчустае... Я, – кагэ, – дажэ ўзяўса за яго. Будто бумага некая. І нічого, – кагэ, – я будто спужаўса... Вісокі такі Ён! І кагэ <Ісус> на міне: «Не дзелай большэ так!»* <А як?> *Ну, ён жа ж угэ знае, шо ён дзелаў... «І мне, – кагэ, – зрабіласо будто страшно... І я кагу: «Добра...» І ён прыйшоў дамоў, дзеўкі, будто яго хто сшэптаў. Пайшоў, лёг і дажа не эта во. І ён і цяпер даказывае, што я точна бачыў Яго*» [**5]. Зноў жа звяртае на сябе ўвагу мяжовая канкрэтнасць, візуальнасць і нават тактыльнасць вербальнай выявы: «*таке будто жоўтае адзеянье на Ём, будто блішчустае, <...> будто бумага некая*».

Па гэтых прыкладах бачна адрозненне апавяданняў пра цуды ў сельскім і гарадскім прыхрамавым асяродках. Па-першае, у гарадскім прыцаркоўным коле легенды-былічкі – апавяданні пра непасрэднае бачанне і сустрэчу з прадстаўніком Боскага свету – сустракаюцца ў якасці выключэнняў, а не правіла. Па-другое, у «гарадскіх» легендах-былічках звышнатуральны персанаж амаль ніколі не апісваецца с такой выразнай рэалістычнасцю. Па-трэцяе, у гарадскім асяродку, калі і сустракаюцца расказы пра сустрэчу з «сівенькім старым», пад якім падразумяваецца пэўны святы (напрыклад, Серафім Сароўскі), яны практычна ніколі не інтэрпрэтуюцца як сустрэча з Богам або анёлам-ахоўнікам.

Сучаснае прыхрамавае гарадское асяроддзе складаецца ў асноўным з людзей пісьмовай культуры і дастаткова высокага адукацыйнага ўзроўню. Многія з іх прышлі да царквы ў дарослым свядомым узросце праз рацыянальнае ўспрыманне хрысціянскай кніжнасці і добра ведаюць па пісаннях свяціцеля Ігнація Бранчанінава, што такое «прелесть» – спакуса, і што Бог і нябесныя сілы не могуць з'яўляцца звычайнаму (грэшнаму) чалавеку. «Всем нам, находящимся в рабстве у греха, надо знать, что общение со святыми Ангелами несвойственно нам по причине нашего отчуждения от них падением, что нам свойственно, по той же причине, общение с духами отверженными <...>, что чувственно являющиеся духи человекам, пребывающим в греховности и падении, суть демоны, а никак не святые Ангелы» [4, 9].

Разам з тым, расказы пра цуды існуюць і нават з'яўляюцца вельмі папулярнымі і ў гарадскім прыцаркоўным коле. Толькі ў гарадскім асяродку яны звычайна прадстаўляюць сабой не легенды-былічкі, а легендарныя апавяданні. Выключэнне складаюць наратывы вакол некаторых вядомых святых месцаў, паломніцкіх цэнтраў – манастыроў. Увогуле расказы-

мемараты паломнікаў пры сустрэчу са старым з катомачкай (у вобразе якога з’яўляецца сам святы Серафім Сароўскі) з’яўляюцца вельмі распаўсюджанымі і папулярнымі.

Легендарныя апавяданні – гэта апавяданні таксама пра цуд у чалавечым жыцці, але ў адрозненні ад легенд-былічак у іх адсутнічаюць звышнатуральныя персанажы. Цуд у легендарных апавяданнях не прарывае, як у легендах-былічках, абалонку будзёнай рэальнасці, калі звышнатуральная Божая сіла бачным, увасобленым чынам ўваходзіць у жыццё чалавека. У легендарных апавяданнях пэўныя рэальныя падзеі ўсведамляюцца чалавекам як наступствы Божай кары або дапамогі.

Легендарныя апавяданні звычайна тэматычна падзяляюцца на блокі «Пакаранне за грэх» і «Божая дапамога». Сярод апавяданняў першага блока самымі распаўсюджанымі з’яўляюцца апавяданні пра разбурэнне цэркваў і мясцовых святынь (крыжоў, крыніц і да т. п.) і пакаранне ўдзельнікаў гэтага разбурэння або іх нашчадкаў. Сярод апавяданняў другога блока – Божая дапамога па малітве.

## *ЛІТАРАТУРА*

1. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў. Гродзенскае Панямонне: у 6 т. Т. 3: у 2-х кн. Кн. 2 / А. М. Боганева [і інш.]; аўт. ідэі Т. Б. Варфаламеева; агул. рэд. Т. Б. Варфаламеевай. Мн., 2006.

2. *Пропп В. Я.* Поэтика фольклора (собрание трудов В. Я. Проппа) / состав., предисловие и коммент. А. Н. Мартыновой. М., 1998.

3. *Шеваренкова Ю. М.* Исследования в области русской фольклорной легенды. Нижний Новгород, 2004.

4. Епископ Игнатий Брянчанинов. Слово о чувственном и о духовном видении духов // Репринтное издание. Епископ Игнатий Брянчанинов. Слово о смерти. М.,1991. С. 3–68.

## ЗАЎВАГІ

*1. Інфармацыя ў дужках <> – пытанні збіральніка або ўдакладненні аўтара артыкула.

*2. Этыялагічныя легенды мы раздзяляем з этыялагічнымі легендарнымі паданнямі: у легендах разглядаецца этыялогія класаў аб’ектаў (птушак, жывёл, раслін, этнасаў, міфалагічных істот і да т. п.) [1, *348–378*], а ў этыялагічных паданнях разглядаецца паходжанне канкрэтнага мясцовага адзінкавага аб’екта (напрыклад, камяня-следавіка, царквы, абраза, капліцы, крыніцы, шануемага дрэва, прошчы і да т. п.) [1, *413–424*].

## СПІС ІНФАРМАНТАЎ

**1. Петручышына Раіса, 1928 г. н., праваслаўная, г. п. Шуміліна Віцебская вобласці. Запісана ў 1998 г.

**2. Кудрыцкая Леакадзія, 1923 г. н., каталічка, в. Талькаўцы Ваўкавыскага раёна. Запісана ў 1999 г.

**3. Грыцак Ніна, 1932 г. н., праваслаўная, в. Знаменка Брэсцкага раёна. Запісана ў 2001 г.

**4. Маркач Соф’я, 1930 г. н., адукацыя 4 кл., праваслаўная, в. Малыя Шылавічы Слонімскага раёна. Запісана ў 2000 г.

**5. Муравейка Надзея Кандрацьеўна, 1942 г. н., праваслаўная, в. Малыя Чучавічы Лунінецкага раёна. Запісана ў 2007 г.